**Пасольства Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы**
**Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў**
*Інстытут еўрапейскіх моў і культур*
*Цэнтр даследаванняў Беларусі імя Я. Коласа*
**Нацыянальны інстытут адукацыі (Рэспубліка Беларусь)**

# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПІСЬМО
## Міжнародная канферэнцыя
## “ЛІТАРАТУРА Ў КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ”,
## прысвечаная народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу
17–18 мая 2019 г.

**Паважаныя калегі!**

Запрашаем Вас прыняць удзел у **Міжнароднай канферэнцыі “Літаратура ў культурнай прасторы Беларусі і Кітая”, прысвечанай народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу,** якая адбудзецца ў Цяньцзінскім універсітэце замежных моў (Кітайская Народная Рэспубліка, г. Цяньцзінь).

Для ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, дактаранты, аспіранты ўстаноў вышэйшай адукацыі, навуковых устаноў.

### Праблемнае поле канферэнцыі

1. Беларуска-кітайскія літаратурныя сувязі: гісторыя, праблемы, перспектывы.
2. Папулярызацыя літаратурнай спадчыны Беларусі і Кітая ў сучасным інфармацыйным грамадстве.
3. Творчасць Якуба Коласа ў сучаснай культурнай прасторы (культуралагічны, гістарычны, сацыяльны, філасофскі, псіхалагічны, педагагічны і метадычны аспекты).
4. Творчая спадчына Якуба Коласа ва ўспрыманні кітайскага чытача.
5. Актуальныя праблемы перакладу мастацкіх твораў з няроднасных моў (з беларускай на кітайскую і з кітайскай на беларускую).

### Арганізацыйны камітэт канферэнцыі

**Сустаршыні:**

**Руды Кірыл Валянцінавіч,** Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, доктар эканамічных навук, прафесар;

**Чэнь Фачунь,** рэктар Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў, доктар філалагічных навук, прафесар, намеснік кіраўніка Вучэбна-метадычнага камітэта па спецыяльнасцях “Замежныя мовы і літаратуры” ў ВНУ пры Міністэрстве адукацыі Кітая.

**Члены аргкамітэта:**

**Ван Мін’юй**, прафесар Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў, доктар філалагічных навук, начальнік Навукова-даследчага цэнтра лінгвасеміятычных даследаванняў Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў, намеснік кіраўніка Вучэбна-метадычнага камітэта па спецыяльнасці “Руская мова і літаратура” ў ВНУ пры Міністэрстве адукацыі Кітая, прэзідэнт Кітайскай навукова-даследчай асацыяцыі па даследаванні мовы і семіётыкі;

**Лі Інін,** дырэктар Інстытута еўрапейскіх моў і культур Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў, PhD, прафесар;

**Валочка Ганна Міхайлаўна,** галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, доктар педагагічных навук, прафесар, запрошаны прафесар Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў;

**Шахаб Вольга Васілеўна,** запрошаны прафесар Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў; PhD, дацэнт.

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, кітайская.

**Форма ўдзелу ў канферэнцыі:** вочная, завочная.

**Заяўкі** на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да 20 красавіка 2019 г.

У заяўцы ўказваюцца: прозвішча, імя, месца працы (краіна, установа), пасада, вучоная ступень, вучонае званне, назва даклада, кантактны тэлефон, паштовы і электронны адрасы, неабходнасць браніравання гасцініцы.

Кожны ўдзельнік канферэнцыі падае толькі адзін матэрыял (персанальна або ў суаўтарстве).

Выданне матэрыялаў канферэнцыі плануецца па выніках яе правядзення. Рэдакцыйны савет пакідае за сабой права адбору матэрыялаў. Матэрыялы, якія не адпавядаюць тэматыцы канферэнцыі, патрабаванням да афармлення або ўтрымліваюць плагіят, адхіляюцца.

**Патрабаванні да матэрыялаў:**

Тэкст даклада падаецца ў электронным (фармат RTF) выглядзе ў аргкамітэт да 18 мая 2019 г.

Памер даклада – да 15 000 друкаваных знакаў з прабеламі ў рэдактары Word for Windows, надрукаваных шрыфтам Times New Roman 14 праз адзін інтэрвал. Усе палі (верхняе, ніжняе, левае і правае) – па 25 мм. У першым радку з левага боку – індэкс УДК. У другім радку з правага боку – прозвішча і ініцыялы аўтара(ў), краіна, горад. Праз радок па цэнтры – назва матэрыялаў вялікімі літарамі. У наступных радках па парадку змяшчаецца кароткая анатацыя і ключавыя словы. Праз радок друкуецца тэкст матэрыялаў (абзацны водступ 1,25). У канцы артыкула прыводзіцца спіс выкарыстанай літаратуры (у алфавітным парадку). Спасылкі на літаратурныя крыніцы па тэксце даюцца ў квадратных дужках у адпаведнасці з нумарам у спісе літаратуры, напрыклад: [2, с. 15].

**Праезд, харчаванне і пражыванне** ўдзельнікаў канферэнцыі за кошт арганізацыі, якая накіроўвае.

**Адрас аргкамітэта:**
117, Machangdao Rd., Tianjin Foreign Study Uninversity,
Tianjin, China 300204

**Заяўкі і тэксты дакладаў** дасылаюцца на электронныя адрасы:
shahab.olga@gmail.com; shahab.olga@yandex.by
Тэл.: +8613022297393;
WeChat – (Olga) ID: wxid_0dc48devtq4722
276093530@qq.com;
Тэл.:+8615522127181;
WeChat – (艳) ID: wxid_v8msolb8ul5j21

ЗАЯЎКА

на ўдзел у **Міжнароднай канферэнцыі**

**“ЛІТАРАТУРА Ў КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ”,**

**прысвечанай народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу**

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара(аў) | |
| Месца работы | |
| Пасада | |
| Вучоная ступень, вучонае званне | |
| Назва даклада | |
| Адрас дакладчыка для перапіскі (+ індэкс) | |
| Тэлефон (+ код) | |
| Факс (+ код) | |
| E-mail | |
| Неабходнасць браніравання гасцініцы | |